ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (840) ● Аўторак, 7 сакавіка 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

8 сакавіка— Міжнародны жаночы дзень

СА СВЯТАМ, ЛЮБЫЯ ЖАНЧЫНЫ! ПОЎНАГА ВАМ ШЧАСЦЯ, НЯСТОМНЫЯ ПРАЦАЎНІЦЫ!

ХАРАКТАРЫСТЫКУ ДАЕ СЕСІЯ

Ад таго, як будзе вучыцца студэнт, наколькі творча ён будзе успрымаць матэрыял і з якой працавітасцю здабываць новыя веды, залежыць паспяховае рашэнне задачы павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Як жа характарызуе цяперашні працэс накаплення ведаў студэнтамі прайшоўшая зімовая экзаменацыйная сесія?

Своечасова здалі усе экзамены 91,2 працэнта студэнтаў дзённага навучання. Выдатныя веды паказалі 14 працэнтаў экзаменаваўшыхся, выдатныя і добрыя —40,8 працэнта, атрымалі змешаныя адзнакі 30,5 працэнта, толькі здавальняюча —6 працэнтаў і нездавальняюча—8,7 працэнта.

Значна вышэй паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах: па гісторыі КПСС — 98 працэнтаў, па марксісцка-ленінскай філасофіі — 98,1, палітэканоміі—98,9, навуковаму камунізму—100. Паспяховасць камсамольцаў па грамадскіх дысцыплінах склала 99 працэнтаў.

Паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання у цэлым па універсітэту у параўнанні з першым семестрам 1970—1971 навучальнага года павысілася на 1 працэнт. Гэта яуна недастаткова і не адпавядае сучасным патрабаванням.

Найбольш высокіх вынікаў на дзённым аддзяленні дабіліся: факультэт журналістыкі (97,1), юрыдычны (96,9), гістарычны (96,7), хімічны (92,7). Панізілася паспяховасць у параўнанні з мінулым навучальным годам на біялагічным факультэце з 92 працэнтаў да 86,6, геаграфічным—з 92 да 90,1 працэнта. Паніжэнне паспяховасці на біялагічным факультэце не выклікала трывогі у метадычнай камісіі, старшыня якой дацэнт К. І. Грышан на працягу семестра, ды і у мінулым навучальным годзе сур'ёзна не займауся аналізам прычын, якія уплывалі на паспяховасць. На матэматычным факультэце у параўнанні з мінулым годам палепшылася паспяховасць на 6,7 працэнта, аднак яна застаецца ніжэй сярэдняй па універсітэту і складае 87,8 працэнта.

Многія студэнты маюць пасрэдныя адзнакі, што сведчыць аб іх слабай самастойнай рабоце. Так, на матэматычным факультэце такіх студэнтаў 19,2 працэнта, фізічным—9, геаграфічным—6,9, прыкладной матэматыкі і журналістыкі—6,4, хімічным—5,5. На гэтых жа факультэтах значны працэнт студэнтаў, атрымаушых нездавальняючыя адзнакі: на матэматычным—12,2 працэнта, фізічным—11, геаграфічным—9,9, прыкладной матэматыкі —9,7, на філалагічным—9,2 у біёлагау — 13,4.

Гэтыя паказчыкі паспяховасці, а адсюль і стан вучэбна - метадычнай і вучэбна - выхаваучай работы выклікаюць заклапочанасць. Камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі гэтых факультэтаў не вядуць настойлівай барацьбы за павышэнне паспяховасці, а натуральна, і за павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Нізкая паспяховасць студэнтаў малодшых курсаў. На першых курсах яна складае 89,2 працэнта, на другіх—89,1 і на трэціх курсах —89,6. Раскрываючы працэнтныя паказчыкі, можна сказаць, што з 559 студэнтаў, атрымаушых нездавальняючыя адзнакі, на фізічны факультэт прыходзіцца 148, матэматычны — 85, прыкладной матэматыкі—84, хімічны—48, біялагічны — 66, геаграфічны — 39. Гэтыя даныя гавораць аб тым, што калектывы кафедр і факультэтаў недастаткова працавалі па арганізацыі дапамогі студэнтам малодшых курсаў у пераадоленні разрыву у метадах навучання у вышэйшай і сярэдняй школе, не змаглі навучыць іх арганізаваць свой час, самастойна і сістэматычна працаваць, не змаглі стварыць старанна прадуманую сістэму, якая выключае стыхійнасць і неарганізаванасць у іх самастойных занятках.

На жаль, на факультэтах не аналізуецца паспяховасць студэнтаў, якія прыйшлі у вну прама са школы, маючых стаж вытворчай працы больш двух год і закончыушых падрыхтоўчае аддзяленне. А без такога аналізу нельга правільна наладжваць вучобу студэнтаў.

Мала яшчэ ўдзяляецца ўвагі рабоце з выдатнікамі. Выдатнікі—гэта наш залаты фонд. Нельга не сказаць добрага слова і аб тых, хто вучыцца толькі на добра і выдатна. Яны — рэзерв папаунення радоў выдатнікаў. Аднак насцярожвае той факт, што даволі значны працэнт студэнтаў атрымлівае змешаныя адзнакі, вучыцца толькі на здавальняюча, а то і заканчвае сесію з двойкамі. Іншым з іх даводзіцца нават пакідаць універсітэт, у які яны у свой час так імкнуліся. Канешне, ёсць сярод гэтай катэгорыі і людзі нядбайныя, але большасці усё ж універсітэцкая праграма не пад сілу. Гэтыя студэнты недастаткова інтэнсіуна працуюць над вучэбным матэрыялам, а многія не зразумелі асаблівасцей навучання ва універсітэце, сутнасць якіх у актыунай, рытмічнай, самастойнай, творчай працы.

Ва універсітэце ёсць усе магчымасці для далейшага павышэння паспяховасці. Неабходна толькі стварыць на кожным факультэце, кафедры, курсе, у вучэбнай групе атмасферу нецярпімасці да двоечнікау, да абыякавасці. Камсамольскія арганізацыі прызваны усямерна садзейнічаць лепшай падрыхтоуцы і выхаванню спецыялістаў — актыуных барацьбітоў за навукова-тэхнічны і сацыяльны прагрэс грамадства, якое будуе камунізм. Яны павінны умець глыбока аналізаваць сутнасць дзейнасці універсітэта, факультэта, знайсці сваё месца ў рашэнні галоўных пытанняу — у гэтым заключаецца майстэрства камсамольскай работы.

У сваю чаргу задача дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедр весці усю работу у цесным кантакце з камсамолам.

У нас 100 працэнтаў студэнтаў — члены прафсаюза. Магчымасці прафсаюзнай арганізацыі вялікія, і было б няправільна зводзіць іх да рашэння толькі матэрыяльна-бытавых пытанняу. Неабходна развіваць ва універсітэцкай і факультэцкіх прафсаюзных арганізацыях выхаваучы бок дзейнасці, накіроуваць іх да актыунага удзелу у выхаваўчай рабоце, павышэнні паспяховасці студэнтаў, каб яны апраўдвалі сваё назначэнне як школа камунізму.

Партыя і народ пастаянна клапоцяцца аб савецкім студэнцтве. З вялікай любоую вымаўляюць савецкія людзі слова «студэнт». І кожны студэнт універсітэта павінен з гонарам насіць гэтае ганаровае званне, з вялікай адказнасцю выконваць свой доуг.

В. ДАЛГАРУКАЎ,
начальнік вучэбнага аддзела.

ЛЮБІМАЯ

Да званка заставалася ўсяго некалькі хвілін, а яны ўсё гаварылі і гаварылі, нягледзячы на тое, што ў лабараторыю ўжо заглядвала нецярплівая змена. Гавораць усе разам, нібы баючыся не паспець.

— На лекцыях ловім яе кожнае слова. Уяўляеце, пісаць канспект — сапраўднае задавальненне.

— Каб вы ведалі, як яна можа захапіць той праблемай, якой займаецца!

— А якія цікавыя прыклады прыводзіць, якія вобразныя ўжывае параўнанні... Адначасова і смешна і захапляюча. Ёй неяк проста ўдаецца растлумачыць складанае.

— Востра адчувае рэакцыю аўдыторыі.

— На лекцыях Людмілы Васільеўны так захапляешся, што калі звініць званок, думаеш з жалем: няўжо ўсё?!

— А які ўважлівы, добры, чулы чалавек. Ніколі не пройдзе міма цябе, каб не распытаць пра жыццё, пра вучобу. З ёй лёгка не толькі на лекцыях.

— Просты і мудры чалавек і выкладчык.

— Ведае ўсіх па імёнах. Нават заве так, як звала б сваіх сыноў.

— Невядома, хто ў кім выклікае любоў: яна ў студэнтаў, ці студэнты ў ёй.

Гэты своеасаблівы дыялог прагучаў у адной з аўдыторый біялагічнага факультэта. У ім прымалі ўдзел студэнты III курса Арыша Збароўская, Толя Скрыпко, Таня Злотнік, Іра Камлач і Валерый Вкусаў. А расказвалі яны пра сваю любімую выкладчыцу Людмілу Васільеўну Кахновіч, якая чытае ў іх курс фізіялогіі раслін. І яшчэ адна маленькая дэталь: калі ішла размова, у лабараторыю ўвайшла яшчэ адна студэнтка. Хвілінку паслухала.

— А я ведаю, пра каго вы гаворыце. Пра Людмілу Васільеўну, праўда?

Яе вельмі любяць тут. А напярэдадні 8 Сакавіка з усёй студэнцкай шчырасцю жадаюць добрага здароўя і вялікіх творчых поспехаў.

Л. ДРУЗЕВА.

Пройдзе яшчэ некалькі тыдняў, і студэнткам хімічнага факультэта Марыі Матун і Алене Рагоцкай давядзецца абараняць дыпломныя работы. А цяпер дзяўчаты старанна апрацоўваюць вынікі сваіх эксперыментаў.

Фота Д. Чаховіча.

У ВНУ КРАІНЫ

Студэнт фізіка-тэхнічнага факультэта Томскага політэхнічнага інстытута У. Вавілаў самастойна вывучае замежныя мовы. У свае 22 гады Уладзімір авалодаў дваццаццю трыма замежнымі мовамі.

Прыступаючы за вывучэння мовы, Вавілаў купляе два аднолькавыя часопісы— на рускай і на адпаведнай замежнай, затым робіць пераклад, імкнучыся запомніць цэлыя фразы. Ён штодзённа завучвае па 25—30 сказаў і к канцу другога месяца даволі свабодна чытае на замежнай мове.

З ВОПЫТУ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

ЦЯЖКА Ў ВУЧЭННІ— ЛЁГКА НА ЭКЗАМЕНЕ

Калі камуністы юрыдычнага факультэта на адкрытым партыйным сходзе абмяркоувалі выніні вучэбна-выхаваучай работы у першым паугоддзі, прыцягнуу увагу вопыт кафедры крымінальнага права, якую узначальвае прафесар І. С. Цішкевіч. Зыходзячы з прынцыпу амаль суварускага—цяжка у вучэнні—лёгка на экзамене,—калектыу кафедры дабіуся глыбокага ведання студэнтамі праграмнага матэрыялу. А пачалі тут з таго, што са студэнтамі адразу ж была дасягнута дагаворанасць: выкладчык будзе весці строгі улік наведвання не толькі семінарскіх заняткау, але і лекцый. Не падрыхтаваныя да заняткау або прапусціушыя іх [хоць адну гадзіну] з'яуляюцца на кансультацыю і здаюць усю тэму.

Як у мінулым, так і у гэтым навучальным годзе у планы заняткау уключалася заданне на паутарэнне пройдзенага матэрыялу. У мінулым годзе паутарэнне было пачата прыкладна за два месяцы да заліку, а у гэтым— з самага пачатку заняткаў. Для праверкі можна было адвесці на кожных занятках толькі 20 мніут. У сувязі з гэтым выкліканым студэнтам [не дабравольна] ставіліся кантрольныя, загадзя не вядомыя ім пытанні па найбольш цяжкіх і складаных раздзелах. Таму рыхтавацца даводзілася па усёй тэме, указанаи для паутарэння. Дамовіліся: не адказау хоць на адно пытанне, прыходзь здаваць усю тэму на кансультацын, не станеш хадзіць на кансультацын — на заліку і экзамене выкладчык праверыць веды усіх тэм без выключэння, а не толькі тых, па якіх ёсць запазычанасць. Накопліваць апошнюю не дазвалялася. Не можаш прыйсці на чарговую кансультацыю, дамоуся з выкладчыкам аб адтэрміноуцы.

Абавязковыя кансультацын давялося праводзіць адзік-два разы у тыдзень. Дамовіліся: калі збіраецца група з некалькіх чалавек, то па яе просьбе праводзіцца нечарговая кансультацыя у зручны для студэнтау час.

Радавала тое, што студэнты ніколькі не скардзяцца на такую патрабавальнасць і напружаную работу на працягу усяго года, разумеюць іх неабходнасць.

Студэнтам давялося па сутнасці рыхтавацца да заліку, а пасля да экзамена увесь час. Была праведзена кантрольная пісьмовая работа па раздзелу «Вучэнне аб пакаранні». У тых жа групах, у якіх скарацілася колькасць вучэбнага часу у сувязі з сельскагаспадарчымі работамі часу для кантрольнай работы не было, яе прыйшлося замяніць кантрольным апытаннем па указанаму раздзелу курса. У час самай напружанай падрыхтоукі да экзаменау [з пачатку снежня] былі праведзены калёквіумы па чатырох найбольш складаных тэмах курса.

І вось вынін экзаменау па Агульнай частцы крымінальнага права на І патоку: атрымалі выдатна — 41 чалавек, добра — 42, здавальняюча — 5. Нездавальняючых адзнак не было. Радуе і тое, што нікому не давялося ставіць ацэнку «з нацяжкай». Глыбокія веды паказалі студэнты В. Бібіла, М. Данільчык, Ю. Дарчук, В. Дзмітрук, С. Далгарукау, В. Кныш, А. Лукашоу, А. Петушкова, О. Плауская, І. Смальянау, С. Саланец, В. Шмошчанка, В. Толмач, А. Чабатароу. Яны акуратна наведвалі лекцыі і практычныя заняткі, старанна да іх рыхтаваліся, актыуна удзельнічалі у абмеркаванні пытанняу, якія разглядаліся на занятках, і гэта дазволіла ім паспяхова вывучыць складаны і цяжкі курс. Можна было б назваць і многіх іншых студэнтау, якія добрасумленна адносяцца да вучобы.

Экзаменатар выстауляу ацэнку спачатку у ведамасць і ужо пасля адкрываў заліковую кніжку. Аб гэтым студэнты былі праінфармаваны з самага пачатку іх работы над курсам: тыя, хто меу раней троікі і чацверкі, маглі атрымаць па крымінальнаму праву больш высокую адзнаку [так і атрымалася у многіх добрасумленных студэнтау].

Добра здалі экзамены па Агульнай частцы крымінальнага права і студэнты II патоку, на якім прымау экзамен дацэнт В. А. Шкурко.

Добрасумленнасць студэнтау пры вывучэнні курса крымінальнага права выявілася і у актыуным удзеле многіх з іх у рабоце навуковага гуртка, а таксама у прапагандзе права сярод насельніцтва.

Добрыя водгукі атрыманы аб лекцыях, прачытаных А. Чабатаровым у Віцебску, В. Талмачом — у Мінску і Хойніцкім раёне Гомельскай вобласці, П. Піцко — у Азёрскай СШ Гродзенскай вобласці, В. Каспяровічам, А. Шчарбіна, А. Лукашовым, С. Ключук — у Мінску. Амаль усе яны выступілі з лекцыямі па некалькі разоу. Чытанне лекцый прынесла вялікую карысць як школьнікам, так і маладым лектарам.

Цяпер студэнты II курса юрфака прыступілі да вывучэння Асаблівай часткі крымінальнага права. У дапамогу ім кафедрай крымінальнага права выдадзен вучэбны дапаможнік «Крымінальнае права БССР. Частка Асаблівая» і падрыхтавана да выдання частка Агульная гэтага ж курса. І гэта, несумненна, будзе садзейнічаць лепшай паспяховасці студэнтау.

І. АРЛОЎ.

НІ АДНАГО АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ!

На павестцы дня расшыранага пленума стаяла адно пытанне: «Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі і задачы на новы семестр». У зале не толькі члены камітэта, але і камсоргі груп, рэдактары насценных газет. Размова ідзе аб самым важным для кожнага з нас — вучобе.

Вынікі сесіі неблагія. Паспяховасць у цэлым па універсітэту павысілася на І працэнт. На першае месца сярод факультэтаў выйшаў журфак. Людміла Цітова, якая узначальвае акадэмічны сектар на факультэце, расказала, што было зроблена, каб падняць аутарытэт акадэмсектара і лепшым чынам арганізаваць яго працу.

У дакладзе прарэктар па вучэбнай рабоце Андрэй Якаулевіч Малышау падкрэсліу, што для некаторых факультэтау гэта сесія не стала тым ліфтам, што паднімае ўгору, а наадварот, тым, што апускае уніз.

Так, на ступеньку ніжэй стау біяфак. Панізілася паспяховасць на геаграфічным факультэце. На матфаку яна ніжэй сярэдняй па універсітэту. Гэта насцярожвае. Значыцца, нягледзячы на вялікую работу, якую правялі кафедры, камітэты камсамола, нешта важнае упушчана.

Патрабаванне да камсамольскага актыву — стварыць атмасферу нецярпімасці да двоечнікау, парушальнікау дысцыпліны. Працаваць карпатліва і паусядзённа. Перш за усё трэба дабіцца таго, каб работа кожнага асобнага студэнта працякала пад кантролем камсамольскай арганізацыі. Аб гэтым гаварыу у сваім выступленні сакратар камітэта камсамола універсітэта Алег Слука.

І у пастанове з'яуляецца пункт, у якім гаворыцца: камсамольскаму актыву акадэмічных груп, курсау, факультэтау рашуча актывізаваць работу па павышэнню асабістай адказнасці кожнага студэнта за выніні вучобы, даваць прынцыповую ацэнку усякім праяуленням нядобрасумленных адносін да заняткау, парушэнням вучэбнай дысцыпліны. Дабіцца таго, каб самастойная работа кожнага студэнта знаходзілася пад уплывам камсамольскай групы, працякала ва умовах таварыскай патрабавальнасці і узаемадапамогі.

Іменна ад таго, як паставлена работа у групе, залежыць — быць паспяховасці высокай ці нізкай, кіпець камсамольскай рабоце ці не. Гэта падкрэслілі у сваіх выступленнях Л. Давыдзенка, (гістфак), М. Прыгодзіч (філфак).

Камсамол БДУ павінен актыуна удзельнічаць у выхаванні добрых спецыялістау, ідэйна загартаваных і палітычна граматных людзей.

Прэс-цэнтр камітэта камсамола.

СТВОРАН САВЕТ

У мэтах далейшага развіцця і ўдасканалення студэнцкай навуковай творчасці у БДУ створан савет па навукова-даследчай рабоце студэнтау. Узначальвае яго прарэктар па навуковай рабоце прафесар Л. В. Валадзько.

На савет ускладзена каардынацыя дзейнасці факультэтау, кафедр, лабараторый і грамадскіх арганізацый БДУ па прыцягненню студэнтау да навуковых даследаванняу, садзейнічанне больш шырокаму прымяненню навуковых даследаванняу у вучэбным працэсе, удасканаленне навуковага кіраўніцтва студэнцкай працай.

Савету даручана падвядзенне вынікау агляду-конкурсу на лепшы факультэт і лепшую кафедру па арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтау.

А. ЛАМЕКА.

Семінар па хіміі ў студэнтаў фізічнага факультэта вядзе старшы навуковы супрацоўнік кафедры радыяцыйнай і радыехіміі А. М. Кавалеўская.

Фота Д. Чаховіча.

РАСПАЎСЮДЖВАЛЬНІКІ ВЕДАЎ

Арганізацыя таварыства «Веды» універсітэта—адна з буйнейшых у рэспубліцы. І не толькі па колькаснаму саставу — яна уключае каля 500 лектараў і прапагандыстаў, — але і па таму аб'ёму работы, з якім спрауляецца. Толькі за апошнія два гады, як адзначыу нядауна старшыня праулення таварыства «Веды» БДУ М. Я. Рэзнікаў на справаздачна-выбарнай канферэнцыі выкладчыкамі, аспірантамі і студэнтамі было прачытана каля 5 тысяч лекцый і больш 66 працэнтаў з іх — па марксісцка-ленінскай тэорыі, унутранай і знешняй палітыцы КПСС і іншых грамадскіх навуках.

Асаблівай увагі заслугоувае паусядзённае і сістэматычнае удасканаленне форм і метадаў работы прапагандыстаў. Пашыраецца профіль і назначэнне народных універсітэтау, цыклаў лекцый, лекторыяў. Актыуна развіваецца такі напрамак укаранення ведаў, як навукова-тэарэтычныя канферэнцыі, калектыуныя выезды лектараў на прамысловыя прадпрыемствы, у калгасы і саугасы, у воінскія падраздзяленні і г. д. Гэта такія формы прапаганды, якія максімальна садзейнічаюць вывучэнню слухачамі асобных палітычных і навуковых праблем, дапамагаюць эфектыуна прымяняць атрыманыя веды у ідэалагічнай і вытворчай дзейнасці. У апошні час было праведзена больш 20 такіх канферэнцый і каля 40 выездау. Найбольш цікавым быу выезд 11 географаў у Маладзечанскі раён. Нашымі вучонымі там быў прачытан цэлы шэраг лекцый: «Зямля — багацце усенароднае», «Ленінскі план электрыфікацыі», «Па дарогах В'етнама», «Наш друг Балгарыя» і іншыя. Паспяховым быў калектыуны выхад членаў арганізацыі «Веды» грамадскіх кафедр — правядзенне Дня вучонага на Мінскім аутазаводзе, прыборабудаўнічым заводзе імя У. І. Леніна, на маторным заводзе, на заводзе «Транзістар» і іншых.

Трэці год пры БДУ працуе лекторый па пытаннях гісторыі і грамадазнаўства, у якім займаюцца каля 300 вучняу дзесятых класау Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Тут чытаюцца лекцыі па гісторыі і палітыцы КПСС, марксісцка-ленінскай тэорыі, эканоміцы, міжнародных адносінах. Гэта адзіны у горадзе лекторый сацыяльна-гістарычнага профілю.

Станоучым момантам у дзейнасці універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» было рашэнне парткома аб замацаванні факультэтау да адпаведных раёнау і прамысловых прадпрыемстваў. Гістарычны факультэт, кафедра гісторыі філасофіі і логікі, напрыклад, шэфствуюць над Стаўбцоускім раёнам, фізфак, біяфак — над Дзяржынскім.

Высокай ацэнкі заслугоувае работа калектыву кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, якую узначальвае прафесар В. І. Сцяпанау. За 1970—1971 гады члены гэтай кафедры правялі каля 20 навукова - тэарэтычных і практычных канферэнцый на прамысловых прадпрыемствах Мінска, у Стаўбцоускім, Смалявіцкім, Барысаускім, Уздзенскім, Нясвіжскім, Самахвалавіцкім, Бялыніцкім і іншых раёнах. Толькі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС імі прачытана каля 180 лекцый, а усяго за апошні год каля 500 лекцый.

Варта адзначыць актыуны удзел у лекцыйнай прапагандзе прафесара Р. А. Левіна, дацэнтау Ю. А. Гусева, Т. П. Багданавай, Э. В. Клёсавай, А. В. Самускевіча і многіх іншых.

Цяпер асаблівую важнасць набывае прапаганда рашэнняў XXIV з'езда партыі. І тут лектары БДУ праявілі сваю ініцыятыву. Яны звярнуліся да усіх навуковых работнікау сталіцы і рэспублікі з заклікам шырэй разгарнуць работу у гэтым напрамку і у сваю чаргу абавязаліся прачытаць 2 тысячы лекцый па гэтай тэматыцы, арганізаваць і правесці 30 калектыуных выездау і 15 навукова-тэарэтычных канферэнцый у гарадах і сёлах рэспублікі, падрыхтаваць для выступленняў з лекцыямі 200 студэнтау. І гэтыя абавязацельствы ужо перавыкананы.

У лектараў і прапагандыстаў БДУ ёсць вялікі рэзерв для няспыннай актывізацыі работы — гэта кадры: выкладчыкі, асіранты. За апошнія гады арганізацыя таварыства «Веды» універсітэта вырасла на 117 чалавек, амаль на 20 працэнтаў. Належную увагу тут трэба аддаць і студэнтам, якія з кожным годам усё больш і больш уключаюцца у карысную для іх лектарскую работу. Студэнты філалагічнага факультэта, напрыклад, арганізавалі і праводзяць кіналекторый «Героі савецкай літаратуры на экране» у кінатэатры «Піянер» для вучняу сярэдніх школ Мінска. Асабліва многа лекцый было прачытана студэнтамі універсітэта ў час зімовых канікул. Бадай, няма такога раёна у Беларусі, дзе б не выступілі нашы юныя прапагандысты.

Ёсць у лектараў БДУ яшчэ многа і нявырашаных праблем. Распрацоуваюцца пастаянная тэматыка лекцый, планы арганізацыйнай работы. Асаблівая увага пры гэтым аддаецца большай даступнасці і практычнай каштоунасці лекцый, іх актуальнасці, злабадзённасці. Больш выступленняу плануецца зрабіць у аддаленых сельскіх мясцовасцях.

А. ЛАНКЕВІЧ.

У ДРУЖБЕ З НАВУКАЙ

На нашы пытанні адказваюць жанчыны — дактары навук.

1. Вашы першыя крокі у навуцы. Чым яна вас прыцягнула? Што лічыце найбольш значным з даследаванага?

2. Вашы сённяшнія планы, задумы.

3. Як спалучаеце навуковую і педагагічную работу? Што дае вам праца са студэнтамі?

4. Ваша грамадская работа?

Ізабела Іванауна МАРЦІНОВІЧ, прафесар кафедры крымінальнага праэсу і крыміналістыкі:

1. Да навукі мяне прыцягнула праца, а прыцягвае у навуцы магчымасць творчасці, самаудасканалення, праяўлення сваёй індывідуальнасці і, вядома, магчымасць быць карыснай людзям.

Першыя крокі, як заусёды, былі цяжкімі і няпэўненымі.

Больш за усё задавальненне мне прыносіць даследаванне гісторыі станаулення органаў юстыцыі нашай рэспублікі. Здаецца, што у гэтых адносінах мне удалося кое-тое зрабіць.

2. Толькі што падрыхтавала да друку манаграфію «Адвакатура у БССР». Наперадзе праца над вучэбным дапаможнікам.

3. Я працую галоўным чынам са студэнтамі I курса. Звычайна у пачатку навучальнага года першакурснікі поўныя жадання уключыцца усе да аднаго у навуковую працу. У студэнцкі навуковы гурток, якім я кірую, запісваецца... да 100 студэнтаў. Вядома, з такім «навуковым калектывам» працаваць нялёгка. Выратуе тое, што да вясны застаецца не больш 10 энтузіястаў. Тым не менш працаваць са студэнтамі карысна. Я лепш асэнсоўваю сваю навуковую тэму, радуюся поспехам сваіх выхаванцаў.

4. Я дэпутат Ленінскага райсавета, намеснік старшыні пастаяннай камісіі па сацыялістычнай законнасці і ахове грамадскага парадку у Ленінскім раённым Савеце, народны засядацель народнага суда Кастрычніцкага раёна, член двух саветаў па прысуджэнню вучоных ступеней, куратар, старшыня таварыскага суда універсітэта... Працы многа, але спраўляцца трэба.

Вольга Раманауна СКАРАХОД, прафесар кафедры аналітычнай хіміі:

1. Мой шлях у навуку пачынаўся з аспірантуры. Вельмі удзячна свайму настаўніку акадэміку Мікалаю Фёдаравічу Ярмоленку, які навучыў мысліць самастойна, творча.

Пісаць навукова-тэарэтычныя работы для мяне ніколі не было самамэтай. Я вельмі любіла працаваць і у гэтай рабоце знаходзіла цікавае. Мае кандыдацкая і доктарская дысертацыі — толькі абагульненне маіх эксперыментаў, вопытаў.

У маёй працы для мяне, здаецца, усё цікавае. Прыемна, што нам удалося выявіць рад важнейшых аналітычных уласцівасцей некаторых новых, раней невядомых арганічных злучэнняў гетрацыклічнага раду і выкарыстаць іх у аналізе рэдкіх элементаў.

2. Хацелася б паглыбіць і пашырыць некаторыя бакі адсорбцыі палімерау. І, вядома, прыемна убачыць поспехі сваіх вучняў. У гэтым месяцы павінен абараняць дысертацыю мой шосты будучы кандыдат навук.

3. Са студэнтамі працаваць заусёды цікава. Каля 30 маіх навуковых прац напісаны у сааутарстве з імі.

4. Я з'яўляюся членам метадычнай камісіі кафедры, удзельнічаю у рабоце факультэцкай групы народнага кантролю.

Любоў Іванауна ФІГЛОЎСКАЯ, прафесар, загадчык кафедры рускай савецкай літаратуры:

1. Навука аб літаратуры, якая стала прызваннем жыцця, перш за усё прыцягнула блізкасцю да духоунага жыцця чалавека. Яна прадугледжвае неабходнае засваенне тых скарбніц прагрэсіунай сацыялістычнай мастацкай літаратуры, без чаго немагчыма забеспячэнне маральнай асновы камунізму.

У працэсе працы я прыйшла да вываду, што патрэбна не толькі высокая агульнаадукацыйная, прафесіянальная падрыхтоука, метадычная узброенасць, але і, перш за усё, глыбокая узаемасувязь жыцця і літаратуры, узрастаючая актыунасць пазіцыі савецкага вучонага, педагога.

Самае, бадай, значнае, што удалося зрабіць у сваёй навукова-педагагічнай рабоце,—гэта свядома адчуваць сябе неад'емнай часцінкай калектыву працаунікоу вышэйшай школы, у прыватнасці Беларускага дзяржаунага універсітэта, па-за дзейнасцю якога жыццё было б бессэнсоуным.

2. Што датычыцца планаў на бліжэйшыя гады, то яны з'яўляюцца працягам папярэдніх.

Хутка будзе завершана кніга «Сучасныя праблемы савецкай літаратуры», якая ствараецца намаганнямі членаў кафедры. Вельмі жадаю, каб усе мае пяць аспірантаў у 1972 годзе падрыхтавалі да абароны кандыдацкія дысертацыі і паспяхова іх абаранілі.

3. На маю думку, студэнтаў неабходна шырэй прыцягваць да навуковай работы, выкарыстоуваючы для гэтай мэты гурткі, спецсемінары. Неабходна уключыць тэматыку іх даследаванняу у планы кафедры.

4. Па роду сваёй дзейнасці і асаблівасцях характару мяне больш за усё прыцягвае ідэйна-выхаваучая работа сярод студэнцтва, лекцыйная прапаганда. Вядома, цяжка спалучаць навукова-даследчую работу з педагагічнай, паколькі апошняя займае асноуны бюджэт часу. І тым не менш каму гэта удаецца, можа лічыць сябе шчаслівым.

Гутарку правёу
А. СВОРАБ.

Больш 30 год працуе у БДУ В. К. ПАЗНЯК, дыспетчар вучэбнай часткі.

З ПЫТАННЯМІ ДА ЖАНЧЫН

ПЕРАДСВЯТОЧНЫ ДЫЯЛОГ

У студэнтаў II курса хімфака ідзе здача папярэдняга калёквіума, які прымае кандыдат хімічных навук Т. І. Тарчанова.

1. Якія клопаты хвалююць вас у гэтыя перадсвяточныя дні?

2. 8 Сакавіка — выхадны. Але не звычайны выхадны. Як вы яго правядзеце?

3. Ад чаго залежыць ваш добры настрой у гэты дзень?

Яугенія Васільеуна ПЕТУШКОВА, выкладчык філасофіі:

1. Як сумясціць 7 сакавіка удзел у рабоце кафедры (на гэтым чамусьці вельмі настайвае мужчынская палова нашага калектыву) з чытаннем лекцый на спецфакультэце прыкладной матэматыкі.

2. Вельмі хацелася б пабываць у гэты дзень на добрым канцэрце.

3. Настрой, канешне, у вельмі вялікай ступені звязан з акружаючымі людзьмі. А так як у перадсвяточныя дні у абсалютнай большасці настрой прыўзняты, то псіхалагічна немагчыма у гэтыя дні быць сумнай.

Ала Міналаеўна АКУЛАВА, сакратар дэканата фізічнага факультэта:

1. У гэтыя дні мяне хвалюе пытанне, як лепш павіншаваць сваіх блізкіх і сябровак з нашым жаночым святам.

2. Для мяне ён будзе звычайным выхадным днём, які я правяду у клопатах аб сям'і.

3. Ад адносін блізкіх і сяброў, а таксама ад надвор'я.

Жана ВАКАЛЮК, сакратар камітэта камсамола патока (фізфак):

1. Падрыхтоука да агляду мастацкай самадзейнасці, святочны вечар.

2. З сябрамі, хлопцамі і дзяўчатамі з маёй групы.

3. Перш за усё ад надвор'я. Ну і, вядома, ад настрою сяброў.

Валянціна Пятроўна ТАМІЛІНА, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі.

1. Клопатаў у мяне заусёды шмат. Зараз усе яны звязаны у асноўным з надыходзячым святам — 50-годдзем утварэння СССР. Нядаўна я закончыла кнігу «Практыкаванні па крыміналістычнай тэхніцы», якая ужо знаходзіцца на рэцэнзаванні, распрацоўваю вельмі цікавую тэму: выкарыстанне дакументаў ілапярэджання злачынстваў. Гэта работа знойдзе і практычнае прымяненне, таму што закранае такую важную праблему, як адносіны да дакументаў, фіксацыю падробак адразу ж на месцы.

2. Самым прыемным будзе новая сустрэча з мастацтвам.

3. Для мяне як для выкладчыка вялікае значэнне маюць адносіны студэнтаў. Ад іх шчырых віншаванняў, увагі залежыць добры настрой у гэты дзень.

Еудакія Харытонауна ЮЗАФОВІЧ, кіяскёр «Саюздруку» у галоўным корпусе:

1. Клопатаў у мяне многа толькі перад 23 лютым. Таму што дома адны мужчыны: муж і два сыны.

2. 8 Сакавіка я заусёды адпачываю. Мае мужчыны усё падрыхтуюць самі, накрыюць стол. Сын звычайна гаворыць: «Мама, гэта твой дзень. Сёння мы будзем аб табе клапаціцца».

3. Настрой у мяне добры заужды.

ЗАЙЗДРАСЦЬ БЕЛАЯ

Мяне папярэджвалі: Валянціна Пятроўна Барадзіна — своеасаблівы чалавек, да яе трэба знайсці падыход.

Значна маладзей свайго узросту, з прыязным выразам на твары, яна адразу падкупіла мяне на шчырасць, і я забыў перасцярогу. Сказаў, хто я, з якой мэтай завітаў. Яна крыху сумелася, а потым усхвалявана пачала:

— Тут нейкая памылка. Я ўжо не куратар, асаблівых заслуг не маю. Педантычны выкладчык ды і усё. Пісаць пра мяне не варта. Ёсць больш дастойныя кандыдатуры, напрыклад, Людміла Андрэеўна Пауловіч. Маладая растучая кандыдат навук, валодае знешняй і ўнутранай абаяльнасцю, якая так неабходна выкладчыку. Студэнты ловяць кожнае яе слова. Ведаеце, як чалавек я ёй зайздрошчу па-харошаму, белай зайздрасцю.

Тут яна ўстала, сказала, што спяшаецца на семінарскія заняткі.

— Дазвольце пабыць у вас на семінары.

Нейкі момант ці то вагалася, ці то разважала, потым згадзілася: пойдзем.

Ад нечаканасці я збянтэжыўся. Валянціна Пятроўна урачыстым голасам аб'явіла: «Людміла Андрэеўна, вось да вас карэспандэнт». І выйшла з аўдыторыі. Пярэчыць у даным выпадку было немагчыма, і я разгублена прысеў на свабоднае месца.

Студэнты выконвалі самастойнае заданне, выкладчык нешта правярала. На мяне перасталі звяртаць увагу. Счакаўшы хвілін з дзесяць, ціха падняўся і падышоў да Людмілы Андрэеўны.

— Даруйце, калі ласка...

Тлумачыць не давялося. Яна панятліва ўсміхнулася: я усё разумею, ад Валянціны Пятроўны падобнае можна чакаць.

Мне гаварылі пра асаблівы характар Валянціны Пятроўны. І вось яго праява. А пагутарыць з ёй патрэбна. Адчуу, калі адступлю, страчу нешта важнае.

На калідоры спыніў белакурую дзяўчыну.

— Вы цяпер былі на занятках у Валянціны Пятроўны?

— Так. А што?

— Скажыце, як яна экзамены прымае?

— Добра. Калі ведаеш, здасі. Пытае грунтоўна.

Высокі хлопец мне сказаў амаль тое самае, дадаўшы, што без прычыны Барадзіна студэнта «не заража». Скідак не робіць, але наколькі прынцыповая, нагэтулькі чулая і уважлівая.

Лепш чым хто, выкладчыкаў ведаюць студэнты. З выпуску у выпуск перадаецца аб іх самая дакладная, самая трапная характарыстыка. Іх слава і аутарытэт не меркнуць. З трапяткім сэрцам, пачуццём унутранай падцягнутасці ідуць студэнты на сустрэчу з імі. Адначасова і жадаюць і баяцца гэтай сустрэчы. Намер адзін —зацвердзіць сябе як студэнта. На геаграфічным факультэце менавіта такой і слыве дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі Валянціна Пятроўна Барадзіна. Яна не схібіць, яе не разжалобіш. Заслужана паставіць двойку. Пазбавяць студэнта-небараку стыпендыі — дапаможа.

Пашанцавала слухаць, як яна разбірала курсавую работу адной студэнткі. Вельмі цярпліва і спакойна даводзіць, што у такім выглядзе работа не можа быць прынята, бо спісана без паняцця са старых падручнікаў. Рэкамендуе патрэбную літаратуру. І нарэшце прапануе свой зборнік «Пытанні геаграфіі», які студэнтцы самой цяжка дастаць.

Усёй душой гэты чалавек цягнецца да студэнтаў. Прывязанасць да іх пераходзіць часам у апякунства. У інтэрнаце, на практыцы, на бульбе ніхто, напэўна, аб іх так не клапоціцца, як Валянціна Пятроўна. Гэта яна дапамагла былым студэнтам Віктару і Тамары Нікалаевым паверыць у каханне, ёй яны абавязаны сваім сямейным шчасцем.

Валянціна Пятроўна не можа пахваліцца здароўем, але спраўляецца не толькі чытаць лекцыі, весці семінарскія заняткі. Шмат год была куратарам. Зараз яе выхаванцы ўжо на пятым курсе. Член групы народнага кантролю, кіраунік навуковага гуртка па эканамічнай геаграфіі. Прынцыповы, адданы камуніст.

Знешне стрыманай, ёю валодае дух нейкай неутаймаванасці. «А ведаеце,—шчыра прызнаецца яна,—каб быў вольны час, я б даследавала усё, што напісаў аб прыродзе Айтматаў».

І, як пяецца ў вядомай песні, чалавек крылы выдумаў таму, што пазайздросціў птушцы. Пастаянная незаспакоенасць, уменне высокай пробай цаніць сябе і іншых—жыццёвае крэда Валянціны Пятроўны. Вучыць яна так, што потым зайздросціць сваім вучням.

Людміла Андрэеўна Пауловіч—яе былая студэнтка.

Л. ПЕТЭРСОН.

Спецкурс па алгарытмічнай мове: й студэнтаў трэцяга і чацвёртага курсаў вядзе асістэнт кафедры МА ЭВМ С. П. ПАСКРОБЫШАВА. Фота Д. Чаховіча.

НА ПРЫЗЫ
«АКТУАЛ» І «ЭФЕКТ»

Рэдакцыя часопіса «Прамысловасць Беларусі» і Беларускі рэспубліканскі савет навукова-тэхнічных таварыстваў з мэтай далейшага развіцця студэнцкай творчасці ў вну рэспублікі праводзяць конкурс на лепшыя студэнцкія навукова-даследчыя і вопытна-канструктарскія работы, накіраваныя на павышэнне эфектыунасці грамадскай вытворчасці.

Для пераможцаў конкурсу установлены два прызы. За найбольш актуальныя распрацоўкі, якія могуць знайсці прымяненне у розных галінах народнай гаспадаркі, штогод будзе уручацца прыз «Актуал» (крыштальны кубак), за эфектыунае канструктарскае або тэхналагічнае рашэнне, укаранёнае на канкрэтным прадпрыемстве, — прыз «Эфект» (крыштальная ваза).

УМОВЫ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца кожны год з 5 студзеня па 5 снежня, у 1972 годзе з 1 сакавіка па 5 снежня. У ім могуць прымаць удзел групы і асобныя студэнты.

Матэрыялы неабходна прадстаўляць у рэдакцыю часопіса (Мінск-86, вул. Славінскага, 1) па рэкамендацыі студэнцкіх навуковых таварыстваў або кіраўпікоу вну з пометкай: «На конкурс «Актуал» або «На конкурс «Эфект». У ходзе конкурсу часопіс будзе інфармаваць чытачоу аб лепшых студэнцкіх даследаваннях і распрацоуках.

ДЗЯКУЙ ЗА ПЕСНЮ

Весела і святочна у перапоуненай зале. Воіны падшэфнай часці сустракаюць сваіх гасцей—студэнцкую агітбрыгаду з факультэта журналістыкі. З першых нумароу канцэртнай праграмы студэнты заваявалі сімпатыі гледачоу. Задушэўна гучыць песня «Там вдали, за рекой» у выкананні С. Будзько і А. Бярэйшык. Спадабаліся вершы А. Ступнікава, выступленне А. Пятрушы, С. Пяткоускага і іншых.

Дзякуй вам, дарагія студэнты, за ваш цікавы канцэрт! Для вас заусёды шырока адчынены дзверы нашага клуба. Зноу чакаем вас!

Н. РАТАРУ,
гвардыі радавы.

Любоу ТАРАСЮК,
студэнтка філфака

ПОЛЕ

«Жыццё пражыць — не поле
перайсці», —
Вучылі мудра нашыя так продкі.
А мне да сталасці расці, расці
І зведаць хлеб, у працы
несалодкі.
Нядобрым словам поле
не крані,
Што ураджаем буйна ускаласіла.
Хай маладога сэрца карані
Бясконца п'юць яго любоу
і сілу!..

ТВАЯ СВЯТЛІЦА

Н. С. ГІЛЕВІЧУ

Гэтак поуна навокал святла,
Што няцяжка у душы
разгубіцца.
Ды сцяжынка мая прывяла
У тваю залатую святліцу.
Толькі сонца сюды зазірне —
Адамкнуцца яе аканіцы,
Адгукнуцца у сэрцы у мяне, —
Як хацелася б тут загасціцца!..
Зноу у песнях ураз ажыве,
Закрасуе багата застолле.
І нанова сябе, цэлы свет
Адкрываць кожны раз
толькі здольвай!
Пабягу раніцой па ваду.
Там з крыніц вечна піць —
не напіцца...
Як у свята, штодзень я іду
У тваю залатую святліцу.

У ДЗЕНЬ 8 САКАВІКА.

— А колькі солі сыпаць?
— Дзве чайныя лыжкі.

— А лыжкі дзе ляжаць!?.

ІНСПЕКТАР ДАРОЖНАГА НАГЛЯДУ

Нейкі дзіуны ён быу, гэты парушальнік. Толькі што перабег вулицу у недазволеным месцы, ледзь пад машыну не трапіу, а усё усміхаецца. Відаць, і сустрэча з міліцыянерам яго нікольк не устрывожыла.

— Штраф? Тры рублі? Калі ласка! Толькі прашу, хутчэй, таварыш старшына, вельмі спяшаюся!

— Будзеце так спяшацца, як цяпер, то баюся, што сёння вас дома не дачакаюцца, — інспектар Латушка не спяшаючыся расшпіліу планшэтку і выняу адтуль бланк для састаўлення пратакола парушэння.

— Ды не дома мяне чакаюць, таварыш старшына, а у ЗАГСе... Расписваюся я сёння... — вочы хлопца свяціліся шчасцем.

І імгненна расцвіу ва усмешцы твар старшыны.

— Віншую, калі так. Толькі не парушайце больш правілы. А ад штрафа вас вызваляю.

Гэта, бадай, адзіны выпадак, калі інспектар дарожнага нагляду Сямён Мікалаевіч Латушка адступіу ад свайго службовага доугу. Звычайна ж ні адно парушэнне грамадскага парадку на участку не выслізгае ад яго вачэй і ні адно не застаецца непакараным.

Яго участак — Ленінскі праспект — самы шматлюдны у горадзе. І самы цяжкі. Не проста паставіць тут справу так, каб бесперабойна і безаварыйна рухауся транспарт, каб пешаходы былі ахаваны ад небяспекі, каб не было парушэнняу грамадскага парадку на вулицы.

І тым не менш узнагароды Латушкі — тры медалі, знак «Выдатнік міліцыі» і 18 грамат ад камандавання — гавораць за яго поспехі. Латушка па праву лічыцца лепшым у горадзе інспектарам дарожнага нагляду.

Часам таварышы па службе просяць Сямёна Мікалаевіча падзяліцца вопытам, раскрыць сакрэт сваіх поспехаў. А сакрэтаў асабліва ніякіх і няма. Проста трэба любіць сваю работу, заусёды быць гатовым прыйсці на дапамогу людзям. Справа, як бачыце, у самых звычайных чалавечых якасцях.

Падышла аднойчы да Сямёна Мікалаевіча бабуля: «Сынок, дапамажы! Ехала вось куліць паліто, ды села не у той аутобус. Забыла там сваю сумку, а у ёй грошы...»

Даручыушы назіранне за пастом свайму стажору, старшына спыніу праходзячую машыну. Пасадзіу туды і бабулю, каб не хвалявалася, паехалі шукаць яе сумку. Хутка у адным з аутобусаў 38-га маршруту яна была знойдзена.

«Дзякуй, сыночак!» — доуга дзякавала жанчына.

Дзякуй... Колькі разоу у дзень чуе старшына гэтае слова!

Але бываюць і непрыемныя размовы, нярэдка і небяспечныя сустрэчы. З адной з іх якраз і пачалася яго служба у міліцыі. Тады ён, учарашні армеец, толькі што змяніу ваенную форму на міліцэйскую. Разам з інспектарам лейтэнантам Галаучынерам нёс першае у сваім жыцці дзяжурства па ахове мірнага спакою грамадзян. Ноччу на Лагойскім тракце, цяперашній вуліцы Я. Коласа, яны спынілі машыну, вадзіцель якой яуна перавышаў скорасць.

— Вашы дакументы? — патрабаваў Галаучынер.

— Дакументы?.. — з рота вадзіцеля вырваўся рэзкі пах спіртнога. — У сумцы мае дакументы. Яна пад сядзеннем.

І раптам, выхапіушы манціроуку, ён замахнуўся на лейтэнанта.

Інспектар, гатовы да усяго, спрытна перахапіу і завучаным рухам вывернуу руку парушальніка. Звякнуушы, упала на маставую манціроука.

Затрыманы аказаўся небяспечным злачынцам, якога ужо шукала міліцыя.

— Цяжкая наша служба, небяспечная, але вельмі патрэбная людзям... — гаварыу пасля лейтэнант Галаучынер свайму малодшаму таварышу.

Сотнямі канкрэтных прыкладаў у службе Латушкі была пацверджана пасля вернасць гэтых слоу. Старшына мог бы успомніць нямала выпадкаў, звязаных з затрыманнем злосных парушальнікаў правіл бяспекі руху, пагоні за аутазладзеямі. За 18 год службы ў міліцыі нямала іх было звязана з небяспекай, з рызыкай для жыцця.

Няправільна было б думаць, што служба інспектара дарожнага нагляду звязана толькі з рухам транспарту і выхаваннем пешаходау. Інспектар — супрацоунік міліцыі — і гэтым сказана усё. Ён — наш сябар і заусёды прыйдзе на дапамогу, у якой бы бядзе вы ні аказаліся. А да чалавека на вуліцы бліжэй за усіх бывае іменна інспектар дарожнага нагляду.

Р. АЎРАМЕНКА,
інструктар ГАІ УУС Мінгарвыканкома.

НАШ ВЕРНІСАЖ

Здымкі студэнта факультэта журналістыкі В. Жука.

АДКАЗЫ НА КРАСВОРД, ЗМЕШЧАНЫ Ў № 5

По горизонтали: **5.** Жаров. **6.** Плиев. **9.** «Мятеж». **11.** Катаев. **12.** Петров. **15.** Жуков. **17.** Бредель. **18.** Абель. **19.** Тренев. **20.** Гайдар. **24.** Карта. **25.** Тихонов. **26.** Анонс. **29.** Снегин. **30.** Синцов. **31.** «Книга». **33.** Стена. **34.** Батов.

По вертикали: **1.** «Шторм». **2.** Мележ. **3.** Фадеев. **4.** Сергей. **7.** Отрада. **8.** «Чайка». **10.** Конев. **13.** Арсений. **14.** Алпатов. **16.** Вирта. **18.** «Атака». **21.** «Фронт». **22.** «Подвиг». **23.** Попов. **27.** Минута. **28.** «Циклон». **34.** Канна. **32.** Ажаев.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, гапоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 01104 Заказ 211.
Тыраж 2000 экз.